У ЛІПЕНІ СОНЦА РАДУЕЦЦА

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: **1.** Прыйшоў ... — адарваў лісток (прык.); прысвятак Пятра і Паўла беларускага народнага календара адзначалі 12 ліпеня. **5.** Кузьма і ... . Прысвятак, які адзначалі 14 ліпеня; у гэтых святых народ бачыў апекуноў сенакосу і дарадчыкаў у падрыхтоўцы да жніва. **10.** «Ліпень ходзіць ... рыжэе. // І сабрана ў стагі сенажаць». З верша А. Астрэйкі «Адзвінела лета». **12.** Унутраная частка чаго-небудзь. **13.** Дзе ... льецца, там шчасліва жывецца (прык.). **14.** Мужчынскае імя. **16.** ... багата, але гасцей малавата (прык.). **18.** Пачуццё моцнага абурэння. **19.** Адно ..., і тое падморгвае (прык.). **21.** Набуханне сокамі зерня, пладоў. **25.** «... праз тыдзень, два. // Наліты колас». З верша А. Лойкі «Сярэдзіна раскошлівага лета». **26.** «Ліпень — з мёдам, // З пшаніцаю — ...». З верша П. Панчанкі «Родная мова». **29.** Шалудзівае ... і ў ліпені дубее (прык.). **30.** «Самы чысты мёд на стале — ... ліпеня». З верша Е. Лось «Лірыка ліпеня».

ПА ВЕРТЫКАЛІ: **2.** Літара грэчаскага алфавіта. **3.** Што ..., то абычай, што старана, то навіна (прык.). **4.** Найсмачнейшы ... ад сваёй працы (прык.). **5.** Лугавая птушка; дзяркач. **6.** Карабельная шлюпка. **7.** У ліпені ... радуецца (прык.). **8.** Не ўсякі дзень ...(прык.). **9.** Ліпень — ...: маланкі кідае, дубы калечыць (прык.). **11.** Ліпень — ... лета (прык.). **15.** Адна партыя якой-небудзь гульні. **17.** Тое, што і гумно. **18.** Прысвятак беларусаў — каталікаў, які адзначаўся 26 ліпеня («Святая ... снапы кладзе» (прык.). **20.** Гарманічнае спалучэнне некалькіх музычных гукаў. **22.** Тая, што жне ўручную. **23.** З ліпеньскім мёдам і ... праглынеш (прык.). **24.** Ласкавы зварот да каго-небудзь (разм., устар.). **27.** Нота музычнай гамы. **28.** Круты бераг, роў.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, *г. Дзяржынск.*

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 1. Лятарок. 5. Дзям'ян. 10. Пагрэтак. 12. Нутро. 13. Песня. 14. Акім. 16. Хата. 18. Гнеў. 19. Вока. 21. Наліў. 25. Жніво. 26. Жніўень. 29. Пара. 30. Ліпіка.
Па вертыкалі: 2. Ро. 3. Кран. 4. Хрэб. 5. Драч. 6. Ян. 7. Сонца. 8. Сята. 9. Гранмаўнік. 11. Верхавіна. 15. Кон. 17. Ток. 18. Ганна. 20. Акорд. 22. Жнар. 23. Ліік. 24. Анён. 27. Фа. 28. Ян.

СЁННЯ

Месяц

Маладзік 13 ліпеня. Месяц у сузор'і Льва.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.55	21.35	16.40
Віцебск —	4.37	21.32	16.55
Магілёў —	4.45	21.25	16.40
Гомель —	4.51	21.13	16.22
Гродна —	5.12	21.48	16.36
Брэст —	5.21	21.41	16.20

Імяніны

Пр. *Ангеліны, Дзям'яна, Кузьмы, Нікадзіма, Пятра.*
К. *Ангеліны, Ізабелы, Бенавентуры, Каміля, Марцэля, Нікадзіма, Якуба.*



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

14 ліпеня

1920 год — нарадзіўся (вёска Сырская Буда Добрушскага раёна) Алесь Астапенка, беларускі паэт, перакладчык. Працаваў на Беларускім радыё, у рэдакцыях рэспубліканскіх газет і часопісаў. Паэтычныя творы прысвечаны ваеннаму подзвігу савецкіх людзей (зборнікі «Выпрабаванне», «Сэрца спявае», «Дзень маёй Радзімы» і іншыя). Пераклаў на беларускую мову паасобныя творы М. Ісакоўскага, Я. Райніса, П. Тычыны. Памёр у 1970 годзе.

1927 год — нарадзіўся (вёска Старая Беліца Гомельскага раёна) Георгій Васілевіч Штыхаў, беларускі археолаг, доктар гістарычных навук, прафесар. Правёў шырокае даследаванне Полацка, Віцебска, Заслаўя, Браслава, Лукомля, Лагойска, Копысі, выявіў гарадзішча старажытнага Барысава, правёў раскопкі паселішча на рацэ Менка. Вывучаў магільнікі трэцяй чвэрці 1-га тысячагоддзя н. э., сінхронныя гарадзішчы банцараўскай культуры. Даследаваў старажытную скульптуру, медную пластыку гарадоў Полацкай зямлі, клады сярэбраных і залатых рэчаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 2018 годзе.

1941 год — у 15 гадзін 15 хвілін прагрымеў першы залп па ворагу нябачанага раней новага віду зброі — рэактыўнай артылерыі. Сем савецкіх установак залпавага агню БМ-13-16 (баявых машын з 16 ракетнымі снарадамі 132 мм на кожнай, якія неўзабаве атрымалі назву «Кацюша»), адначасова ўдарылі па чыгуначнай станцыі горада Оршы, забітай нямецкімі саставамі з цяжкай ваеннай тэхнікай, боепрыпасамі і гаручым. Эфект адначасовага (7-8 секундаў) удару 112 ракет быў узрушальным у прамым і пераносным сэнсе, усё вакол запалала. Так у Вялікую Айчынную вайну ўступіла Першая асобная эксперыментальная батарэя рэактыўнай артылерыі пад камандаваннем капітана Івана Андрэевіча Флёрава.

1743 год — нарадзіўся Гаўрыла Раманавіч Дзяржавін, рускі паэт, дзяржаўны дзеяч. У 1780—1790 гадах на высокіх дзяржаўных пасадах. Аўтар філасофскіх од, вершаваных трагедый, камедый, аўтабіяграфічных «Запісак», філасофскіх і літаратурна-крытычных прац. У 1793—1794, 1799 гадах быў у Беларусі (Віцебск, Шклоў, Лёзна), арганізоўваў дапамогу галодным. У «Запісках» спагадліва пісаў пра беларускі народ, яго нацыянальную самабытнасць. Памёр у 1816 годзе.

1918 год — нарадзіўся Інгмар Бергман, шведскі рэжысёр кіно і тэатра. Пастаноўшчык фільмаў «Усмешкі летняй ночы», «Сёмая пячатка», «Фані і Аляксандр» і іншых. Удастоены мноства прэстыжных міжнародных узнагарод у галіне кінамастацтва. Памёр у 2007 годзе.

1933 год — пачалася Арктычная экспедыцыя на ледакольным параходзе «Чалюскін», якую ўзначальваў савецкі вучоны акадэмік Ота Шміт, выхадзец з Магілёва. 13 лютага 1934 года «Чалюскін» затануў, раздушаны льдамі. За выратаваннем экспедыцыі сачыў увесь свет. Вясной 1934 года ўдзельнікі экспедыцыі былі вывезены на мацярык савецкімі лётчыкамі.

УСМІХНЕМСЯ

Да чаго прыводзіць неасцярожнасць?

Калісьці неасцярожна распрануў жанчыну — і цяпер сорак гадоў запар вымушаны яе апранаць.

— Хлопчык, ты з кім у садку гуляеш?
— З хлопчыкамі.
— А чаму з дзяўчынкамі не гуляеш?
— Грошай няма!

Прыкмета: калі чалавек хваліць сваіх суседзяў, значыць ён сабраўся прадаваць кватэру.

Расіяне пасля дамашняга чэмпіянату свету па футболе.
— Та-ак, марылі ўбачыць фінал Расія — Бразілія, але не атрымалася.
— Падвялі нас бразільцы, падвялі.



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2562. Нумар падпісаны ў 19.30 13 ліпеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12